# Паазерскія алені.

Год таму ў Беларусі з’явілася першая ферма, на якой пачалося разведзенне элітных высакародных аленяў.



Прытулак для хутканогіх жывёл знаходзіцца ў самым цэнтры азёрнага краю — на памежжы Браслаўскага і Мёрскага раёнаў, недалёка ад вядомага возера Абстэрна. Вальер на 80 гектараў размешчаны на маляўнічых пагорках у мінулым на іх былі хутарскія гаспадаркі і адносіцца да адкрытага акцыянернага таварыства ”Абстэрна”. На абнесенай плошчы вольна пасвяцца 150 статных і не надта асцярожных лясных прыгажуноў і прыгажунь.

Кожны дзень сюды да сваіх гадаванцаў прыязджае захавальнік Раман Антушэвіч мясцовы жыхар і егер “Абстэрна”. Ён адказны па ўліку пагалоўя, раздае корм і сочыць за станам здароўя яшчэ маладой папуляцыі жывёл.

У сакавіку 2014 года мы набылі больш за сто аленіх і шэсць быкоў найлепшых еўрапейскіх ліній вытворцаў. За гэты час самкі аленяў нарадзілі больш за сто сорак аленянят, кажа егер Раман Антушэвіч. — А сёлега атрымалі новае — ужо з беларускай радаслоўнай пакаленне высакакласных аленяў. Мапуляцыя паазерскіх аленяў для паляўнічых гаспадарак у хуткім часе значна палепшыцца за кошт пашай фермы.

Дзіўна, як жывёлы рэагуюць на з’яўленне егера. Пачуўшы гук яго ўсюдыхода, алені ўважліва глядзяць у бок дарогі і, толькі машына спыняецца каля варот вальера, брыдуць да загарадкі з кармушкамі, бо ведаюць, што ў гэты час ім будзе сытны і смачны ласунак.

Наперадзе заўсёды бягуць два самцы-сяголеткі, якіх Раман выходжваў, калі яны былі зусім маленькімі, з прычыны, што іх матулі кінулі малых, не давалі малака. Егер забраў аленянят дадому і глядзеў да той пары, пакуль яны добра ўвабраліся ў сілу, падраслі, сталі самастойнымі. І цяпер, калі егер з’яўляецца на ферме, гэтыя сіроты-сяголеткі першыя бягуць павітацца са сваім гаспадаром.

За летні час у паляўнічай гаспадарцы прайшла нарыхтоўка кармоў на будучы халодны сезон, праведзена кантрольнае ўзважванне пагалоўя, вядзецца апрацоўка жывёл ад інфекцый. І ў той жа час дабудоўваецца новы вальер, у якім будуць паляваць, як у старажытныя часы — з лукам і стрэламі.

***Анатоль ЮІЯШЧУК***

***Фота аўтара Мёрскі раён***

**Источник:** Родная прырода. - 2015. - № 9. - С. 18-19.

